УДК 378:61(474.5-25)(091)“17/18”

**А. А. Дзенісевіч,** кандыдат гістарычных навук
Дзяржаўная навуковая ўстанова «Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі»,
вул. Акадэмічная, 1, 220072 Мінск, Рэспубліка Беларусь, +375 (25) 616 87 07, denisevich1988@mail.ru

# НАЙНОЎШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГІСТАРЫЯГРАФІЯ ГІСТОРЫІ МЕДЫЦЫНСКАЙ НАВУКІ Ў ВІЛЕНСКІМ УНІВЕРСІТЭЦЕ Ў АПОШНЯЙ ЧВЭРЦІ XVIII — ПЕРШАЙ ТРЭЦІ XIX СТАГОДДЗЯ

У артыкуле аналізуюцца навуковыя даследаванні беларускіх вучоных перыяду 1992—2022 гадоў, прысвечаныя гісторыі станаўлення і развіцця медыцынскай навукі ў Віленскім універсітэце. Апісаны асноўныя напрамкі даследаванняў беларускіх навукоўцаў па гісторыі медыцынскай навукі ў Віленскім універсітэце.

**Ключавыя словы:** Віленскі ўніверсітэт; навука; медыцына; гісторыя навукі; гістарыяграфія.
Бібліягр.: 39 назваў.

**A. A. Dzenisevich,** PhD in History
The State Scientific Institution “The Institute of History of the National Academy of Sciences of Belarus”, 1 Academic Str., 220072 Minsk, the Republic of Belarus, +375 (25) 616 87 07, denisevich1988@mail.ru

# THE MODERN BELARUSIAN HISTORIOGRAPHY OF THE HISTORY OF MEDICAL SCIENCE AT THE UNIVERSITY OF VILNA IN THE LAST QUARTER OF THE XVIII — THE FIRST THIRD OF THE XIX CENTURY

The article analyzes the scientific studies of the Belarusian scientists in period of 1992—2022, dedicated to the history of the formation and development of medical science at the University of Vilna. The main research directions of the Belarusian scientists in the field of history of medical science at the University of Vilna are described.

**Key words:** the University of Vilna; science; medicine; history of science; historiography.
Ref.: 39 titles.

**Уводзіны.** Вялікую зацікаўленасць у беларускіх даследчыкаў у перыяд 1992—2022 гадоў выклікала гісторыя станаўлення і развіцця медыцынскай навукі ў Віленскім універсітэце. Гэта тлумачыцца тым, што Віленскі ўніверсітэт з’яўляўся вядучай установай падрыхтоўкі медыцынскіх кадраў і правядзення навуковых медыцынскіх даследаванняў на беларускіх землях у апошняй чвэрці XVIII — першай трэці XIX стагоддзя. З Віленскім універсітэтам быў звязаны лёс многіх таленавітых вучоных-медыкаў, нараджэнцаў Беларусі. Мэтай артыкула з’яўляецца комплекснае вывучэнне найноўшай беларускай гістарыяграфіі гісторыі медыцынскай навукі ў Віленскім універсітэце. Даследаванне гэтай праблемы дазваляе не толькі паглыбіць веды аб навуковых дасягненнях беларускіх медыкаў, выхаванцаў Віленскага ўніверсітэта, але і таксама выявіць нявырашаныя пытанні па гісторыі станаўлення медыцынскай навукі на беларускіх землях і вызначыць напрамкі далейшых даследаванняў.

**Матэрыялы і метады даследавання.** Крыніцамі даследавання з’яўляліся працы беларускіх навукоўцаў перыяду 1992—2022 гадоў, прысвечаныя асаблівасцям станаўлення і развіцця медыцынскай навукі ў Віленскім універсітэце ў апошняй чвэрці XVIII — першай трэці XIX стагоддзя. Пры напісанні артыкула аўтар карыстаўся як адмысловымі гістарычнымі метадамі (гісторыка-сістэмны, гісторыка-тыпалагічны, гісторыка-параўнальны), так і агульнанавуковымі: аналіз, сінтэз, апісанне, тлумачэнне.

**Вынікі даследавання і іх абмеркаванне.** Даследаваннем гісторыі медыцынскай навукі ў Віленскім універсітэце займаліся як гісторыкі, так і прадстаўнікі медыцынскай і біялагічнай навук. Сярод іх неабходна выдзеліць асобу Ф. І. Ігнатовіча, які ўнёс істотны ўклад у вывучэнне гэтай тэмы. Ён стаў аўтарам кандыдацкай дысертацыі і шэрагу навуковых артыкулаў па гэтай праблеме. У яго дысертацыі былі разгледжаны пытанні зараджэння навуковай гігіенічнай думкі і санітарнай практыкі на

© Дзенісевіч А. А., 2022



Репозиторий БарГУ

беларускіх землях у апошняй чвэрці XVIII — першай палове XIX стагоддзя [1]. Беларускі вучоны паказаў ролю беларускіх медыкаў, супрацоўнікаў і выпускнікоў медыцынскага факультэта Віленскага ўніверсітэта ў стварэнні гігіены як навукі ў Беларусі і Літве. Аўтарам былі разгледжаны навуковыя працы па гігіене і эпідэміялогіі А. Л. Бекю, антрапалагічныя даследаванні Ю. Ясінскага, навуковая дзейнасць у галіне судзебнай таксікалогіі І. Ф. Адамовіча [1, с. 38, 42, 46].

Асаблівую ўвагу трэба звярнуць на артыкул Ф. І. Ігнатовіча, які ён прысвяціў вывучэнню навуковай, лекарскай і дабрачыннай дзейнасці нараджэнца Навагрудчыны І. І. Аржахоўскага. З яго артыкула стала вядома, што прыгонны селянін І. І. Аржахоўскі ўнёс значны ўклад у развіццё беларускай медыцынскай навукі ў XIX стагоддзі. Ён не толькі паспяхова скончыў медыцынскі факультэт Віленскага ўніверсітэта, але і напісаў і абараніў доктарскую дысертацыю, прысвечаную хваробам лёгкіх [2, с. 97]. Ф. І. Ігнатовіч устанавіў цікавы факт, што каб атрымаць навуковую ступень, І. І. Аржахоўскі падрабіў дакументы аб сваім паходжанні. Аўтар артыкула адзначыў, што ў XIX стагоддзі вучоныя, выхадцы з прыгонных сялян, не маглі прэтэндаваць на атрыманне навуковай ступені, таму вымушаны былі ісці на падман і здабываць фальшывыя дакументы аб сваім дваранскім або мяшчанскім паходжанні [2, с. 97].

Ф. І. Ігнатовічам была даследавана навуковая дзейнасць першага беларускага медыцынскага антраполага Ю. Ясінскага. Яму не ўдалося выявіць назву доктарскай дысертацыі, падрыхтаванай і абароненай Ю. Ясінскім у Віленскім універсітэце, але ён зрабіў дэталёвы аналіз галоўнага навуковага твора Ю. Ясінскага «Антрапалогія аб фізічных і маральных уласцівасцях чалавека», апісаў навуковыя погляды беларускага медыка [3, с. 114—115; 4, с. 30; 5, с. 569].

Асобны артыкул Ф. І. Ігнатовіч прысвяціў прафесійнай і навуковай дзейнасці нараджэнца Гродна Казіміра Забелы. Артыкул дазваляе даведацца, што Казімір Забела скончыў медыцынскі факультэт Віленскага ўніверсітэта і абараніў доктарскую дысертацыю, прысвечаную хваробам ног [6, с. 51—52]. Ф. І. Ігнатовіч падкрэсліў, што Казімір Забела меў трох братоў-урачоў — Франца, Паўла і Станіслава. Франц і Павел скончылі медыцынскі факультэт Віленскага ўніверсітэта, прычым Франц атрымаў ступень доктара медыцынскіх навук [6, с. 55].

Ф. І. Ігнатовічам была даследавана дзейнасць на ніве медыцынскай навукі беларускага вучонага, выпускніка Віленскага ўніверсітэта І. Ф. Адамовіча. Ён устанавіў, што І. Ф. Адамовіч зрабіў важны ўклад у вывучэнне таксікалогіі і судзебнай медыцыны і стаў аўтарам шэрага навуковых прац па гэтых напрамках медыцынскай навукі [7, с. 109]. Ф. І. Ігнатовічам апісаны медыка-гідралагічныя даследаванні І. Ф. Адамовіча і паказаны яго ўклад у развіццё аптэкарскай справы на Беларусі.

Ф. І. Ігнатовіч стаў сааўтарам артыкула, у якім быў даследаваны ўклад у медыцынскую навуку і практыку беларускага медыка выпускніка Віленскага ўніверсітэта І. Я. Нагумовіча. Рагледжана яго доктарскае даследаванне і прааналізаваны змест яго важнейшага навуковага твора, прысвечанага вывучэнню лекарскіх якасцяў мінеральных водаў [8, с. 73—75].

Неабходна ўзгадаць, што беларускі даследчык Ф. І. Ігнатовіч вывучаў навуковую дзейнасць замежных вучоных-медыкаў, чый лёс быў звязаны з беларускай зямлёй і Віленскім універсітэтам. Для гэтых вучоных беларуская зямля стала другой Радзімай. Сярод іх вылучаюцца асобы французскіх вучоных Ж. Э. Жылібера і К. І. Вірыёна. У дысертацыі і артыкулах Ф. І. Ігнатовіча былі апісаны навуковыя даследаванні Ж. Э. Жылiберам лекавых раслін, анатоміі чалавека і жывёл, заразных хвароб, паказаны яго ўклад у стварэнне медыцынскага перыядычнага друку. Ф. І. Ігнатовічам быў дадзены падрабязны аналіз навуковага твора «Флора Літвы» і часопіса «Даследаванні прыроды Літвы…», якія былі падрыхтаваны французкім вучоным падчас працы ў Гродзенскай медыцынскай акадэміі і Віленскім універсітэце [1, с. 30—35; 4, с. 28; 5, с. 569; 9, с. 23—25].

Ф. І. Ігнатовічам была дадзена характарыстыка жыцця і навуковай дзейнасці французскага вучонага К. І. Вірыёна [10; 11]. У сваіх артыкулах аўтар адзначыў, што менавіта на беларускай зямлі французскаму вучонаму ўдалося рэалізаваць многія свае намеры і працы. К. І. Вірыён працаваў у Нясвіжы, Гродне і Вільне, стварыў у Гродзенскай губерніі дзяржаўную сістэму аховы здароўя. К. І. Вірыён займаў пасаду загадчыка кафедры анатоміі Віленскага ўніверсітэта, стаў ганаровым членам гэтага ўніверсітэта [10, с. 114—115; 11, с. 78—79]. У перыяд свайго жыцця на беларускіх землях французскі вучоны займаўся даследаваннем заразных хвароб людзей і жывёл, вывучэннем анатоміі. Навуковых прац, апублікаваных французам, аўтару артыкула выявіць не ўдалося. Ф. І. Ігнатовіч падкрэсліў, што ўзровень навуковай кваліфікацыі К. І. Вірыёна быў адзначаны ў публікацыях Ж. Э. Жылібера.

Важны ўклад у вывучэнне гісторыі медыцынскай навукі ў Віленскім універсітэце ўнесла І. В. Панцюк. У сваёй дысертацыі яна выявіла перадумовы развіцця навуковай медыка-хімічнай думкі ў Беларусі. Аўтарам дысертацыі ўстаноўлена, што выдзяленне «медыцынскай хіміі» як навуковай



Рэпазіторый БарДУ

дысцыпліны на беларускіх землях адбылося ў другой палове XVIII стагоддзя. Менавіта ў гэты час з'явіліся першыя перакладныя падручнікі па гэтай вобласці медыцынскай навукі. І. В. Панцюк даследаваны першыя публікацыі беларускіх навукоўцаў, якія змяшчалі элементы медыка-хімічных ведаў. Яна правяла аналіз навуковых прац прафесара Віленскага ўніверсітэта Анджэя Снядэцкага "Poczathi chemii" и "Teorya jestestw organicznych", паказала ролю беларускага навукоўца ў папулярызацыі медыка-хімічных ведаў у Беларусі і Літве. І. В. Панцюк апісала навуковую канцэпцыю Анджэя Снядэцкага аб развіцці жыцця як працэсу пастаяннай змяняемасці і станаўлення [12, с. 28—30]. І. В. Панцюк былі апісаны медыка-гідралагічныя даследаванні беларускіх медыкаў Я. Румеля, І. Я. Нагумовіча, К. І. Грум-Гржымайла [12, с. 30—32].

Вывучэнню асаблівасцей станаўлення і развіцця медыцынскай мікрабіялагічнай навукі на беларускіх землях у XVIII—XX стагоддзях была прысвечана дысертацыя беларускай даследчыцы Т. Г. Святловіч [13]. У сваім дысертацыйным даследаванні Т. Г. Святловіч выявіла перадумовы развіцця медыцынскай мікрабіялогіі на беларускіх землях у XVIII — першай палове XIX стагоддзя, прааналізавала змест першых прац беларускіх вучоных выхаванцаў Віленскага ўніверсітэта, якія працавалі на беларускай зямлі ў той час. Аўтарам упершыню выяўлены даследаванні, звязаныя з вывучэннем паразітарных тыфаў І. І. Каржанеўскага, апісаны навуковыя даследаванні ў галіне вывучэння заразных хвароб А. Л. Бекю, Л. Я. Нагумовіча, Ф. А. Рымкевіча [13, с. 5—6].

Т. Г. Святловіч стала таксама сааўтарам артыкула, у якім разглядзела структуру медыцынскага факультэта Віленскага ўніверсітэта, асаблівасці арганізацыі вучэбнага працэсу для студэнтаў-медыкаў, апісала навуковыя даследаванні беларускіх медыкаў С. Б. Юндзіла, А. Л. Бекю, В. Д. Герберскага, М. Л. Гамаліцкага, К. І. Парцянка, Ф. А. Рымкевіча [14, с. 51—53].

Асаблівасці фарміравання Віленскай навуковай медыцынскай школы, пытанні арганізацыі падрыхтоўкі навуковых кадраў у галіне медыцыны ў Віленскім універітэце былі даследаваны В. А. Шаршуновым. Ён разглядзеў пытанні нарматыўна-прававога забеспячэння працэсу падрыхтоўкі вучоных-медыкаў і раскрыў ролю Віленскага ўніверсітэта ў стварэнні і развіцці расійскай сістэмы падрыхтоўкі і атэстацыі кадраў вышэйшай навуковай і педагагічнай кваліфікацыі. Вынікамі яго навуковых даследаванняў сталі манаграфія і артыкулы [15—18]. Ён паказаў уклад у медыцынскую навуку наступных беларускіх вучоных: А. І. Абіхта, В. К. Абламовіча, Т. М. Аўгусціновіча, А. Ф. Адамовіча, Б. Барсука, А. Л. Бекю, В. Д. Герберскага, В. Д. Гіндэнбурга, М. Л. Гамаліцкага, К. І. Грум-Гржымайла, А. Т. Карэвы, І. І. Каржанеўскага, Л. Я. Нагумовіча, К. І. Парцянка, Ф. А. Рымкевіча, А. Савіцкага, Л. С. Сяўрука, Э. І. Эйхвальда, Ю. Ясінскага [15, с. 69—70; 18, с. 245—252]. У працах В. А. Шаршунова былі раскрыты асаблівасці прысуджэння навуковых ступеняў, у тым ліку ў галіне медыцыны, у Віленскім універсітэце [16, с. 86; 17, с. 175—176; 18, с. 266—273]. В. А. Шаршуноў устанавіў, што ў Віленскім універсітэце студэнты, якія мелі навуковыя дасягненні, маглі атрымаць медыцынскую кваліфікацыю без экзаменаў. У якасці прыкладу ён прывёў нараджэнца Магілева П. Ф. Гаранінава, які за навуковыя заслугі ў вывучэнні хлора атрымаў аптэкарскую кваліфікацыю без экзаменаў [18, с. 251].

Вывучэнню развіцця медыцынскіх навуковых ведаў на беларускай зямлі ў другой палове XVII — першай чвэрці XX стагоддзя быў прысвечаны раздел манаграфіі В. Я. Бездзель, В. М. Хаданёнак. Аўтарамі была апісана навуковая спадчына беларускіх медыкаў, супрацоўнікаў Віленскага ўніверсітэта: А. М. Матусевіча (акушэрства), А. Л. Бекю (паталогія, гігіена, эпідэміялогія), В. Д. Герберскага (афтальмалогія, паталогія), А. І. Абіхта (унутраныя хваробы), К. І. Парцянка (хірургія, афтальмалогія, дэсмургія), Ф. А. Рымкевіча (фізіялогія, паталогія, тэрапія), В. В. Пелікана (хірургія, анатомія, даследаванне анеўрызм), А. Ф. Адамовіча (гісторыя медыцыны, бальнеалогія, ветэрынарная медыцына) [19, с. 121].

Аўтары манаграфіі апісалі навукова-даследчую дзейнасць выпускнікоў Віленскага ўніверсітэта К. І. Грум-Гржымайла, Ю. Ясінскага, Л. Я. Нагумовіча, І. І. Каржанеўскага, Л. С. Сяўрука. Паказаны ўклад К. І. Грум-Гржымайла ў развіццё ваенна-палявой хірургіі і курарталогіі, апісаны навуковыя дасягненні Ю. Ясінскага ў галіне антрапалогіі, навуковыя заслугі ў галіне ваеннай медыцыны Л. Я. Нагумовіча, навуковыя дасягненні ў вывучэнні дэсмургіі, артапедыі, хірургіі І. І. Каржанеўскага, навуковая спадчына ў галіне паталагічнай анатоміі Л. С. Сяўрука [19, с. 122—123, 128, 135].

В. Я. Бездзель, В. М. Хаданёнак сталі аўтарамі артыкула, у якім ахарактарызавалі стан медыцынскай навукі ў беларускіх губернях у канцы XVIII — першай палове XIX стагоддзя ў кантэксце еўрапейскіх тэндэнцый развіцця медыцыны. Аўтары далі ацэнку дзейнасці беларускіх медыкаў з Віленскага ўніверсітэта і запрошаных замежных вучоных у справе станаўлення беларускай і ўзбагачэння еўрапейскай медыцынскай навукі. У артыкуле былі апісаны навуковыя дасягненні беларускіх вучоных-медыкаў А. Ф. Адамовіча, А. І. Абіхта, В. В. Пелікана, К. І. Грум-Гржымайла [20, с. 37—39].

Репозиторий БарГУ

Сярод навуковых прац, прысвечаных вывучэнню гісторыі медыцынскай навукі на беларускіх землях, трэба вылучыць бібліяграфічны даведнік «Гісторыя медыцыны Беларусі ў біяграфіях яе ўрачоў. XVII — першая палова XX стст.», падрыхтаваны О. А. Кульпановіч [21]. У гэтым даведніку аўтар сабрала звесткі аб прафесійнай і навуковай дзейнасці 2 000 беларускіх медыкаў, у тым ліку прадстаўнікоў Віленскага ўніверсітэта: А. Ф. Адамовіча, К. І. Грум-Гржымайла, А. Л. Бекю, Казіміра Забелы, М. Л. Гамаліцкага, І. І. Каржанеўскага [21, с. 78, 141, 150, 174, 213].

Удзел беларускіх вучоных, прадстаўнікоў Віленскага ўніверсітэта, у станаўленні медыцынскай навукі на беларускіх землях у першай палове XIX стагоддзя быў даследаваны беларускім навукоўцам А. Г. Майсяёнкам [22—24]. Ён стаў аўтарам навуковых публікацый, прысвечаных навуковай дзейнасці беларусіх вучоных-медыкаў М. Л. Гамаліцкага, А. Л. Бекю, Анджэя Снядэцкага. А. Г. Майсяёнкам была даследавана педагагічная і навуковая дзейнасць у галіне эксперыментальнай фізіялогіі М. Л. Гамаліцкага [22, с. 12—16]. А. Г. Майсяёнак даў ацэнку навукова-медыцынскай спадчыны А. Л. Бекю, апісаў яго заслугі ў справе барацьбы з эпідэміямі, дасягненні ў рэформе шпіталей і сістэмы медыцынскай адукацыі Беларусі і Літвы [23, с. 44—46]. У артыкуле, прысвечаным навуковай спадчыне Анджэя Снядэцкага, А. Г. Майсяёнкам былі адлюстраваны асноўныя палажэнні эпігеністычнай тэорыі беларускага медыка, зроблены дэталёвы аналіз яго навуковых прац, асвечана дзейнасць па папулярызацыі медыцынскіх навуковых ведаў [24, с. 631—634].

Працэс ператварэння Віленскага ўніверсітэта ў вядучы цэнтр падрыхтоўкі медыцынскіх кадраў і правядзення навуковых медыцынскіх даследаванняў на беларускіх землях у першай палове XIX стагоддзя быў даследаваны Ю. К. Абаевым [25]. Ён разглядзеў прынцыпы арганізацыі вучэбнага працэсу на медыцынскім факультэце Віленскага ўніверсітэта, апісаў асноўныя напрамкі даследаванняў і навуковыя працы беларускіх вучоных Анджэя Снядэцкага, Э. І. Эйхвальда, С. Б. Юндзіла, Б. Барсука, А. Л. Бекю, М. Л. Гамаліцкага, В. Д. Герберскага, В. В. Пелікана, К. І. Парцянка, І. І. Каржанеўскага, Л. С. Сяўрука. Асаблівую каштоўнасць артыкулу Ю. К. Абаева надае тое, што ў ім быў прыведзены спіс тэм доктарскіх дысертацый па медыцыне, абароненых беларускімі навукоўцамі ў першай палове XIX стагоддзя [25, с. 71—73]. Ю. К. Абаевым была паказана роля навуковага супольніцтва Віленскага ўніверсітэта ў развіцці медыцынскага перыядчынага друку на беларускіх землях.

Важнае навуковае значэнне мае артыкул В. П. Грыцкевіча, у якім ён паказаў уплыў медыцынскага факультэта Віленскага ўніверсітэта на развіццё аховы здароўя і медыцынскай навукі на беларускіх землях [26]. В. П. Грыцкевіч зрабіў вывад, што ў сярэдзіне XIX стагоддзя асноўную частку медыцынскіх кадраў на Беларусі складалі нараджэнцы беларускіх губерняў і выхаванцы Віленскага ўніверсітэта. Ім была разгледжана навуковая дзейнасць беларускага медыка Ф. Т. Эме, французскага навукоўца Ж. Э. Жылібера і італьянскага вучонага С. Л. Бізэа [26, с. 497—498]. Артыкул В. П. Грыцкевіча з'яўляецца важнай навуковай крыніцай па гісторыі беларускай медыцынскай навукі. Аўтарам былі пералічаны прозвішчы беларускіх навукоўцаў, якія атрымалі навуковую ступень доктара медыцыны ў Віленскім універсітэце ў XVIII—XIX стагоддзях [26, с. 499—500].

Асаблівасці развіцця аховы здароўя і навуковых медыцынскіх даследаванняў на беларускіх землях ў IX—XX стагоддзях былі раскрыты ў артыкуле, аўтарамі якога сталі Н. Н. Піліпцэвіч, Т. П. Паўловіч, А. Н. Піліпцэвіч [27, с. 73—79]. Асобнае месца ў артыкуле заняла асвячэнне ролі прадстаўнікоў Віленскага ўніверсітэта ў станаўленні і развіцці навуковых медыцынскіх ведаў на беларускай зямлі. Аўтары артыкула паказалі ўклад у беларускую медыцынскую навуку такіх вучоных, як Ю. Ясінскі, А. М. Матусевіч, А. Л. Бекю, В. В. Пелікан, В. Д. Герберскі, М. Л. Гамаліцкі, Ф. А. Рымкевіч [27, с. 78—79].

Неабходна ўзгадаць і артыкул Я. М. Цішчанка. Аўтар вылучыў асноўныя рысы, якія былі ўласцівы медыцыне Беларусі ў XIX стагоддзі, падкрэсліўшы, што беларускія медыкі, у тым ліку выхаванцы Віленскага ўніверсітэта, не толькі сталі заснавальнікамі новых навуковых напрамкаў, але і зрабілі шэраг адкрыццяў, якія мелі глабальнае значэнне для чалавецтва [28, с. 92—93].

В. А. Ярмоленка даследаваў навуковую дзейнасць урачоў-беларусаў, чый лёс быў звязаны з Віленскім універсітэтам. У фокусе яго даследаванняў апынуліся навуковыя працы І. І. Каржанеўскага, К. І. Грум-Гржымайла, Л. Я. Нагумовіча, В. В. Пелікана [29, с. 50, 56—59].

Навуковыя дасягненні ў сферы медыцыны вучонага К. І. Грум-Гржымайла былі апісаны беларускім даследчыкам У. Г. Хамяковым. Ён апублікаваў у часопісе «Беларускі мерыдыян» бібліяграфічныя звесткі аб беларускім медыку з указаннем яго навуковых прац [30, с. 139]. Медыцынскі накірунак даследаванняў вучонага М. Л. Гамаліцкага быў разгледжаны беларускай даследчыцай Л. С. Джэжора [31]. Прафесійная, навуковая і педагагічная дзейнасць рэктара Віленскага ўніверсітэта доктара

Рэпазіторый БарДУ

медыцыны В. В. Пелікана была даследавана С. А. Сушковым, Ю. С. Нібыліцынай, Л. М. Мядзведзевай, Ж. В. Брыль [32—34]. Яны апісалі навуковыя поспехі В. В. Пелікана ў лячэнні анеўрызм, анатоміі, паказалі яго ўклад у падрыхтоўку навуковых кадраў у галіне медыцыны [32, с. 4; 33, с. 64—65; 34, с. 378].

Важны ўклад у вывучэнне гісторыі медыцынскай навукі ў Віленскім універсітэце ўнёс І. І. Трацяк [35; 36]. У яго артыкулах былі разгледжаны навуковыя медыцынскія даследаванні беларускіх вучоных А. Л. Бекю, М. Л. Гамаліцкага, В. Д. Герберскага, В. В. Пелікана, І. І. Каржанеўскага, К. І. Парцянка, Ф. А. Рымкевіча, Р. Сымановіча, А. Ф. Адамовіча, Я. Ф. Нішкоўскага, С. Б. Юндзіла [35, с. 80—82; 36, с. 66—68]. У працах І. І. Трацяка былі прадстаўлены статыстычныя звесткі аб абароненых ва ўніверсітэце доктарскіх дысертацыях па медыцыне за перыяд 1816—1832 гадоў [35, с. 79; 36, с. 65]. І. І. Трацяк прасачыў агульную колькасць працуючых прафесараў універсітэта ў 1803—1832 гадах і ўстанавіў, што амаль 90 % прафесараў медыцыны былі выхадцамі з этнічнай Беларусі [35, с. 80; 36, с. 66].

У перыяд 1992—2022 гадоў у фокусе даследаванняў беларускіх навукоўцаў апынуўся і такі напрамак медыцынскай навукі, як ветэрынарная медыцына. Гэтай праблеме прысвяціў свой артыкул беларускі даследчык А. С. Білецкі [37]. Аўтар раскрыў ролю Віленскага ўніверсітэта ў працэсе станаўлення і развіцця ветэрынарнай навукі і падрыхтоўкі ветэрынарных урачоў для беларускіх губерняў у першай палове XIX стагоддзя. У артыкуле апісаны асаблівасці адкрыцця і функцыянавання Ветэрынарнай школы ў Віленскім універсітэце, даследавана дзейнасць першых беларускіх медыкаў-ветэрынараў А. Ф. Адамовіча, К. Муйшэла, Ф. Юневіча [37, с. 14—19]. А. С. Білецкі зрабіў таксама аналіз сацыяльнага, тэрытарыяльнага, лічбавага складу навучэнцаў Ветэрынарнай школы Віленскага ўніверсітэта [37, с. 16].

У 1992—2022 гадах беларускіх навукоўцаў зацікавіла гісторыя развіцця псіхіятрыі на медыцынскім факультэце Віленскага ўніверсітэта. Гэта тэма была даследавана У. У. Дукорскім і В. Л. Дукорскай. Яны вывучалі навуковую дзейнасць першага беларускага псіхіятра Ф. А. Рымкевіча. Аўтары апісалі навуковыя погляды Ф. А. Рымкевіча на псіхічныя хваробы. У іх артыкуле была дэталёва прааналізавана класіфікацыя нервовых і псіхічных хвароб, распрацаваная Ф. А. Рымкевічам [38, с. 275—277]. Аўтары паказалі таксама ўклад Ф. А. Рымкевіча ў падрыхтоўку навуковых медыцынскіх кадраў і ўказалі колькасць доктарскіх медыцынскіх дысертацый, выкананых пад яго кіраўніцтвам [38, с. 277]. Прааналізаваўшы матэрыялы ўніверсітэцкіх лекцый Ф. А. Рымкевіча, У. У. Дукорскі і В. Л. Дукорская прыйшлі да высновы, што беларускі медык першым у Расійскай імперыі пачаў шырока выкладаць псіхіятрыю і заклаў аснову для далейшага развіцця гэтай навукі на беларускай зямлі.

У 1992—2022 гадах беларускімі навукоўцамі даследаваліся асаблівасці і ўмовы стварэння медыцынскага факультэта ў Віленскім універсітэце. Так, А. П. Цыхун раскрыў ролю беларускага вучонага М. Пачобут-Адляніцкага ў заснаванні вышэйназванага факультэта [39, с. 57].

**Заключэнне.** Аналіз гістарыяграфіі дазваляе зрабіць вывад, што ў 1992—2022 гадах беларускія вучоныя працавалі над шырокім спектрам тэм па гісторыі медыцынскай навукі ў Віленскім універсітэце. У гэты час былі апублікаваны навуковыя працы, прысвечаныя як даследаванню цэлых напрамкаў медыцынскай навукі (гігіена, медыцынская біяхімія, медыцынская мікрабіялогія, ветэрынарная медыцына), так і вывучэнню навуковых дасягненняў асобных беларускіх вучоных, прафесараў Віленскага ўніверсітэта, у галіне хірургіі, псіхіятрыі, фармакалогіі, медыцынскай антрапалогіі, курарталогіі. У 1992—2022 гадах былі апублікаваны навуковыя працы, у якіх былі разгледжаны асаблівасці падрыхтоўкі навуковых кадраў у галіне медыцыны, апісаны працэдуры прысуджэння медыцынскіх навуковых ступеняў у Віленскім універсітэце.

Беларускімі даследчыкамі было ўстаноўлена, што ў сярэдзіне XIX стагоддзя на беларускіх землях большасць медыцынскіх кадраў, у тым ліку з навуковымі ступенямі, з'яўлялася выпускнікамі Віленскага ўніверсітэта. Трэба зазначыць, што біяграфіі і навуковыя дасягненні многіх беларускіх медыкаў з Віленскага ўніверсітэта яшчэ застаюцца недаследаванымі. Па-за рамкамі даследаванняў беларускіх навукоўцаў таксама засталіся і пытанні матэрыяльна-тэхнічнага і кадравага забеспячэння падрыхтоўкі вучоных-медыкаў, фінансавання навуковых медыцынскіх даследаванняў у Віленскім універсітэце. Гэтыя пытанні могуць стаць прадметам для далейшых навуковых даследаванняў.

**Спіс цытаваных крыніц**

1. *Игнатович, Ф. И.* Развитие гигиенической науки и санитарной практики в западных регионах Беларуси : дис. … канд. мед. наук : 14.00.07 ; 07.00.10 / Ф. И. Игнатович. — Гродно, 2001. — 194 л.

2. *Игнатович, Ф. И.* Доктор медицины из крепостных И. И. Оржеховский, его профессиональная и благотворительная деятельность / Ф. И. Игнатович // Журн. ГрГМУ. — 2003. — № 1. — С. 96—98.



Рэпазіторый БарДУ

3. *Игнатович, Ф. И.* Доктор философии, медицины и хирургии И. Ясинский / Ф. И. Игнатович // Сестринское дело, здравоохранение, история медицины : проблемы и перспективы : сб. ст. / ГрГМУ, Обществ. об-ние сред. мед. работников Гродн. обл. ; отв. ред.: Е. М. Тищенко, И. И. Хваленя. — Гродно, 2010. — С. 112—116.

4. *Игнатович, Ф. И.* Вклад ученых и воспитанников Гродненской медицинской академии в развитие медико-биологических наук в Белоруссии и Литве / Ф. И. Игнатович // Дзеячы аховы здароўя і медыцынскай навукі Беларусі і Літвы на пераломе XVIII—XIX стст. : матэрыялы навук.-практ. канф., 11—12 траўня 1992 г. / пад агул. рэд. В. С. Ялейнікавай. — Гродна ; Белавічы, 1992. — С. 27—31.

5. *Игнатович, Ф. И.* Развитие научно-практических исследований по школьной гигиене в западном регионе Беларуси в конце XVIII — начале XX века / Ф. И. Игнатович // Здоровье и окружающая среда : сб. науч. тр. / М-во здравоохранения Респ. Беларусь, Респ. науч.-практ. центр гигиены. — 2008. — Вып. 12. — С. 568—571.

6. *Игнатович, Ф. И.* К. С. Забелло — директор Белостокской повивальной школы и врачебный инспектор Гродненской губернии / Ф. И. Игнатович // Проблемы сестринского дела и здравоохранения : сб. ст., посвященный 20-летию высш. сестр. образования / редкол.: Е. М. Тищенко (отв. ред.), С. Ф. Антонович (зам. отв. ред.), Н. Е. Антонович. — Гродно : ГрГМУ, 2011. — С. 51—55.

7. *Игнатович, Ф. И.* Провизор И. О. Адамович, его профессиональная и благотворительная деятельность в Гродно / Ф. И. Игнатович // Журн. ГрГМУ. — 2010. — № 1. — С. 108—110.

8. *Ігнатовіч, Ф. І.* Ізідор Нагумовіч — лекар і грамадскі дзеяч першай паловы XIX стагоддзя // Ф. І. Ігнатовіч, А. П. Госцеў, А. С. Талерчык // Дзеячы аховы здароўя і медыцынскай навукі Беларусі і Літвы на пераломе XVIII—XIX стст. : матэрыялы навук.-практ. канф., 11—12 траўня 1992 г. / пад агул. рэд. В. С. Ялейнікавай. — Гродна ; Белавічы, 1992. — С. 73—76.

9. *Игнатович, Ф. И.* Ж. Э. Жилибер и его попытка издания медико-биологического журнала в Гродно / Ф. И. Игнатович // Гарадзенскія чытанні : зб. матэрыялаў ДУК "Гродзен. абл. навук. б-ка імя Я. Ф. Карскага", аддз. краязнаўства / склад. Л. І. Турмасава ; навук. рэд. С. В. Марозава. — Гродно, 2011. — С. 19—27.

10. *Игнатович, Ф. И.* Доктор медицины И. И. Вирион: новые данные о жизни и деятельности в Беларуси в последней четверти XVIII — начале XIX века / Ф. И. Игнатович // Журн. ГрГМУ. — 2009. — № 4. — С. 114—116.

11. *Игнатович, Ф. И.* Доктор медицины И. И. Вирион — первый врачебный инспектор Гродненской губернии / Ф. И. Игнатович // Дзеячы аховы здароўя і медыцынскай навукі Беларусі і Літвы на пераломе XVIII—XIX стст. : матэрыялы навук.-практ. канф., 11—12 траўня 1992 г. / пад агул. рэд. В. С. Ялейнікавай. — Гродна ; Белавічы, 1992. — С. 77—79.

12. *Пантюк, И. В.* Становление и развитие медицинской биохимии в Беларуси (XVIII в. — начало 1990-х гг.) : дис. … канд. биол. наук : 03.00.04 ; 07.00.10 / И. В. Пантюк. — Пинск, 1999. — 176 л.

13. *Светлович, Т. Г.* Развитие медицинской микробиологической науки и практики в Беларуси (XVIII в. — 1990-е годы) : автореф. дис. … канд. мед. наук : 07.00.10 / Т. Г. Светлович. — М., 1997. — 24 с.

14. *Светлович, Т. Г.* Виленский университет и его выпускники — уроженцы Белоруссии в экспозиции Музея истории медицины Беларуси / Т. Г. Светлович, Т. П. Разуменко // Дзеячы аховы здароўя і медыцынскай навукі Беларусі і Літвы на пераломе XVIII—XIX стст. : матэрыялы навук.-практ. канф., 11—12 траўня 1992 г. / пад агул. рэд. В. С. Ялейнікавай. — Гродна ; Белавічы, 1992. — С. 51—54.

15. *Шаршунов, В. А.* Виленский университет — "Alma mater" науки и образования Беларуси и Литвы / В. А. Шаршунов // Вышэйш. шк. — 2002. — № 2. — С. 73—76 ; № 3. — С. 66—70 ; № 4. — С. 72—76 ; № 5. — С. 46—49.

16. *Шаршунов, В. А.* История создания государственной системы аттестации ученых и педагогов в Российской империи / В. А. Шаршунов // Проблемы упр. — 2007. — № 3 (24) — С. 74—91.

17. *Шаршунов, В. А.* Формирование системы подготовки и аттестации педагогов на ученую степень в западноевропейских и Виленском университетах с 1130 по 1832 гг. / В. А. Шаршунов, Д. В. Шаршунов // Проблемы упр. — 2008. — № 1 (26). — С. 169—178.

18. *Шаршунов, В. А.* Формирование системы образования и науки в Беларуси (XII — начало XX в.) : монография / В. А. Шаршунов. — Минск : Мисанта, 2016. — 704 с.

19. *Бездзель, В. Я.* Беларускія вучоныя, даследчыкі і вынаходнікі ў галіне тэхнічных і натуральных навук (другая палова XVII — першая чвэрць XX ст.) : манаграфія / В. Я. Бездзель, В. М. Хаданёнак. — Віцебск : ВДТУ, 2018. — 179 с.

20. *Бездзель, В. Я.* Беларускія медыкі-навукоўцы ў кантэксце развіцця еўрапейскай медыцыны ў канцы XVIII — першай палове XIX ст. / В. Я. Бездзель, В. М. Хаданёнак // Уч. зап. — 2017. — Т. 23. — С. 36—39.

21. *Кульпанович, О. А.* История медицины Беларуси в биографиях ее врачей. XVII — 1 половины XX вв. : библиогр. справ. / О. А. Кульпанович. — Минск : Медисонт, 2011. — 462 с.

22. *Майсяёнак, А. Г.* Другая прафесія доктара медыцыны Міхала Гамаліцкага / А. Г. Майсяёнак, П. Шарэйка // Дзеячы аховы здароўя і медыцынскай навукі Беларусі і Літвы на пераломе XVIII—XIX стст. : матэрыялы навук.-практ. канф., 11—12 траўня 1992 г. / пад агул. рэд. В. С. Ялейнікавай. — Гродна ; Белавічы, 1992. — С. 12—17.

23. *Мойсеёнок, А. Г.* Август Бекю из Гродно — доктор медицины, профессор Виленского университета / А. Г. Мойсеёнок, П. Шарейко // Дзеячы аховы здароўя і медыцынскай навукі Беларусі і Літвы на пераломе XVIII—XIX стст. : матэрыялы навук.-практ. канф., 11—12 траўня 1992 г. / пад агул. рэд. В. С. Ялейнікавай. — Гродна ; Белавічы, 1992. — С. 44—47.

24. *Мойсеёнок, А. Г.* К 250-летию Андрея (Енджея) Снядецкого — выдающегося ученого-биолога, химика, врача, педагога и общественного деятеля / А. Г. Мойсеёнок // Журн. ГрГМУ. — 2018. — Т. 16, № 5. — С. 631—635.

25. *Абаев, Ю. К.* У истоков отечественной медицинской науки / Ю. К. Абаев // Здравоохранение. — 2014. — № 6. — С. 67—75.

26. Медицина в X—XVIII вв. / В. П. Грицкевич // Очерки истории науки и культуры Беларуси IX — начала XX в. / В. П. Грицкевич [и др.]. — Минск : Навука і тэхніка, 1996. — С. 493—500.

27. *Пилипцевич, Н. Н.* Развитие здравоохранения Беларуси в IX—XX в. / Н. Н. Пилипцевич, Т. П. Павлович, А. Н. Пилипцевич // Вопросы организации и информатизации здравоохранения : рецензируемый аналитико-информ. бюл. — 2009. — № 2 — С. 73—79.

28. *Тищенко, Е. М.* Отличительные черты медицины Белоруссии XIX века / Е. М. Тищенко // Дзеячы аховы здароўя і медыцынскай навукі Беларусі і Літвы на пераломе XVIII—XIX стст. : матэрыялы навук.-практ. канф., 11—12 траўня 1992 г. / пад агул. рэд. В. С. Ялейнікавай. — Гродна ; Белавічы, 1992. — С. 92—93.


Репозиторий БарГУ

29. *Ермоленко, В. А.* Белорусы в истории мировой медицины / В. А. Ермоленко // Гісторыя: праблемы выкладання. — 2008. — № 8. — С. 55—60 ; № 9. — С. 47—51.

30. *Хамякоў, У. Г.* Грум-Гржымайла Кандрат Іванавіч. Да 220 годдзя з дня нараджэння / У. Г. Хамякоў // Магіл. мерыдыян. — 2013. — № 3—4 (22—23), т. 13, вып. 3—4. — С. 139.

31. *Джэжора, Л. С.* 3 снежня 2021 г. — 230 гадоў з дня нараджэння Міхаіла Лявонавіча Гамаліцкага (1791—1861), урача-фізіёлага, гісторыка, члена Віленскай археалагічнай камісіі, літаратара, педагога [Электронны рэсурс] / Л. С. Джэжора // Краязнаўства Берасцейшыны. — Рэжым доступу: http://kb.brl.by/index.php/heritage/item/2624-3-snezhnya-2021-g-230-gadou-z-dnya-naradzhennya- mikhaila-lyavonavicha-gamalitskaga-1791-1861-uracha-fizijolaga-gistoryka-chlena-vilenskaj-arkhealagichnaj-kamisii-litaratara-peda goga . — Дата доступу: 08.07.2022.

32. *Медведева, Л. М.* Колесо судьбы. Венцеславу Венцеславовичу Пеликану посвящается / Л. М. Медведева, Ю. С. Небылицин // Новости хиругии. — 2008. — Т. 16, № 3. — С. 2—8.

33. *Медведева, Л. М.* Венцеслав Венцеславович Пеликан — хирург, исследователь, педагог / Л. М. Медведева, С. А. Сушков, Ю. С. Небылицин // Материалы XI республиканской научной конференции по истории медицины и фармации / отв. ред. Э. А. Вальчук, Е. М. Тищенко. — Минск : РНМБ, 2009. — С. 64—65.

34. *Бриль, Ж. В.* Венцеслав Пеликан великий хирург или реакционер? / Ж. В. Бриль // Актуальные вопросы современной медицины : материалы 56-ой итоговой науч.-практ. конф. студентов и молодых ученых ВГМУ. — Витебск : ВГМУ, 2004. — С. 378—379.

35. *Трацяк, І. І.* Беларускія прафесары Віленскага ўніверсітэта (1803—1832 гг. ) / І. І. Трацяк // Ігнат Анацэвіч : жыццёвы шлях, педагагічная і навуковая спадчына : матэрыялы рэгіян. навук. канф. (Малая Бераставіца, 21 кастр. 2005 г.) / рэдкал.: С. А. Габрусевіч [і інш.]. — Гродна : ГрДУ, 2008. — С. 78—90.

36. *Трацяк, І. І.* Прафесары медыцынскага факультэта Віленскага ўніверсітэта / І. І. Трацяк // Язык. Общество. Медицина : материалы семинара преподавателей «Теория и практика преподавания белорусского и русского языков: достижения, проблемы и перспективы развития» / редкол.: А. А. Мельникова (отв. ред.) [и др.]. — Гродно, 2009. — С. 64—69.

37. *Билецкий, А. С.* Роль Виленского университета и медико-хирургической академии в подготовке ветеринарных специалистов на белорусских землях / А. С. Билецкий // Сельское хозяйство — проблемы и перспективы : сб. науч. тр. / НАН Беларуси, М-во сел. хоз-ва и продводбствия Респ. Беларусь, ГрГУ. — Гродно, 2018. — Т. 40 : Ветеринария. — С. 12—20.

38. *Дукорский, В. В.* Первый белорусский психиатр / В. В. Дукорский, О. Л. Дукорская // Психиатрия, психотерапия и клин. психология. — 2017. — Т. 8, № 2. — С. 273—282.

39. *Цыхун, А. П.* Ураджэнец Гродзеншчыны Марцін Пачобут-Адляніцкі — адзін з заснавальнікаў медычнага факультэта ў Вільні / А. П. Цыхун // Дзеячы аховы здароўя і медыцынскай навукі Беларусі і Літвы на пераломе XVIII—XIX стст. : матэрыялы навук.-практ. канф., 11—12 траўня 1992 г. / пад агул. рэд. В. С. Ялейнікавай. — Гродна ; Белавічы, 1992. — С. 55—58.

Паступіў у рэдакцыю 14.09.2022.

Репозиторий БарГУ